# ДАПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА Ў СІСТЭМЕ МЕДЫЯАДУКАЦЫІ НА ПРЫКЛАДЗЕ СУМЕСНЫХ ПРАЕКТАЎ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ БДУ І КАНАЛА «КУЛЬТУРА» БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ

**Г. І. Басава, К. А. Сітнік**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

На мяжы XX–XXI стагоддзяў назіраецца пераход да прэфігуратыўнай (дыялогавай) цывілізацыі [2, с. 360]. У якасці яе характэрных асаблівасцей вылучаецца прызнанне дзіцяці паўнапраўнай і значымай асобай у грамадстве. У рэалізацыі міжпакаленчага дыялогу дапамагаюць сродкі масавай інфармацыі, якія ствараюцца дзецьмі, падлеткамі сумесна з дарослымі [3, с. 4–5]. Уключэнне навучэнцаў у медыяпрастору ў пазіцыі яе стваральнікаў ці сустваральнікаў дае ім магчымасці для праяўлення творчай ініцыятывы, садзейнічае каштоўнасна-сэнсаваму самавызначэнню і самарэалізацыі. Сёння медыя – комплексны сродак засваення чалавекам акаляючага свету (у яго сацыяльных, маральных, псіхалагічных, мастацкіх, інтэлектуальных аспектах). Для таго, каб чалавек свабодна арыентаваўся ў інфармацыйным патоку, яму неабходна мець навыкі ўспрымання інфармацыі. Гэта можа забяспечыць медыяадукацыя – вядучы напрамак педагогікі XXI стагоддзя.

Факультэт журналістыкі БДУ праводзіць мэтанакіраваную падрыхтоўку навучэнцаў школ, гімназій, ліцэяў, шукае і знаходзіць новыя эфектыўныя метады работы з імі. Дзейнасць факультэта накіравана на выяўленне творчых якасцей асобы, прабуджэнне і замацаванне цікавасці да прафесіі журналіста. У апошні час уведзена практыка ўзаемадзеяння студэнтаў-цьютараў і навучэнцаў-абітурыентаў у Школе маладога журналіста, у сацыяльных сетках, дзе створаны чаты і старонкі для хуткага ўзаемадзеяння і дапамогі абітурыентам. Вопыт сумеснай працы студэнтаў і навучэнцаў дазваляе абітурыентам вызначыцца ў правільнасці выбару будучай прафесіі, далучыцца да жыцця факультэта. Пры гэтым задача цьютараў заключаецца не толькі ў тым, каб запрашаць паступаць менавіта да нас і з гэтай мэтай трымаць пастаянную сувязь з абітурыентамі, ар-

ганізоўваць розныя мерапрыемствы, але і прыцягваць ускосна, праз удзел школьнікаў у факультэцкім жыцці. Як паказвае практыка, менавіта слухачы Школы маладога журналіста ствараюць канкурэнцыю абітурыентам без спецыяльнай падрыхтоўкі і больш гатовыя да прафесійнай дзейнасці.

Неабходнасць запрашаць навучэнцаў школ, гімназій, ліцэяў да ўдзелу ў медыяасветніцкіх праектах выклікана не толькі тым, што гэта ўнікальная магчымасць для дапрафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў у сферы медыя, але таксама і тым, што сама медыяадукацыя знаходзіцца на мяжы інфармацыйнай і адукацыйнай палітыкі. Таму, напрыклад, радыё «Культура» ў пытаннях медыяасветы не абмяжоўваецца працай толькі штатных супрацоўнікаў. У рамках Школы маладога журналіста абітурыенты факультэта журналістыкі БДУ супрацоўнічаюць з куратарамі ад радыё і студэнтамі-цьютарамі на базе праграмы «ДНК» і рыхтуюць уласныя праграмы для эфіраў. Адзін з напрамкаў праекта – «На хвалі з абітурыентам», які дае магчымасць праявіць сябе ў розных жанрах радыёжурналістыкі. Адным падабаецца самастойна пісаць увесь тэкст для рубрыкі, іншыя хочуць яшчэ да пачатку вучобы на журфаку вучыцца працаваць непасрэдна з аўдыторыяй і спрабуюць браць каментары, каб пасля зманціраваць усё разам у тэматычны выпуск, і такім чынам адразу выпрацоўваць і ўменне браць інтэрв’ю, і развіваць навык працы з прафесійнымі камп’ютарнымі праграмамі. Так, напрыклад, Лізавета Крылова першую сваю праграму прысвяціла навагоднім мелодыям з мультфільмаў: спецыяльна выбірала самыя знакамітыя і запамінальныя трэкі, да кожнага з якіх рыхтавала невялікі каментар, пасля агучыла свой жа тэкст у студыі і зманціравала яго з песнямі ў праграму. Валерыя Голубева абрала іншы шлях у раскрыцці святочнай тэмы: яна апытала сваіх знаёмых пра падрыхтоўку падарункаў сваім сябрам, а пасля аб’яднала ўсе водгукі ў адну перадачу.

Як бачым, падобныя праекты садзейнічаюць знаёмству моладзі з сучаснымі медыя, спрыяюць павышэнню ўзроўню яе медыяадукаванасці, рыхтуюць будучых студэнтаў факультэта журналістыкі да прафесійнай дзейнасці яшчэ да паступлення, развіваюць іх творчы патэнцыял і пашыраюць жанравую разнастайнасць праграм праекта «ДНК».

«На хвалі з абітурыентам» – не адзіны праект радыё «Культура», у межах якога праводзіцца актыўная медыяасветніцкая дзейнасць з падрастаючым пакаленнем. Сумесна з дзіцяча-падлеткавым інтэлектуальным часопісам «Бярозка» штомесяц ладзіцца праграма «Чытацкі клуб», у якой у фармаце жывога абмеркавання школьнікі абмяркоўваюць творы беларускай і сусветнай літаратуры. На такія сустрэчы таксама запрашаюцца аўтары ці перакладчыкі тых ці іншых выданняў, што спрыяе наладжванню кантакту паміж аўтарамі і чытачамі. Дзякуючы гэтай праграме ў навучэнцаў ёсць магчымасць выказаць сваё меркаванне па розных пытаннях, што ўзнікаюць падчас абмеркавання прачытанага, павысіць узровень чытацкай культуры. Праект спрыяе заахвочванню моладзі да чытання і разважання над добрай, якаснай літаратурай. Усё гэта садзейнічае развіццю падлеткаў як творчых асоб, якія ўмеюць разважаць над прачытаным, глыбока аналізаваць літаратурныя творы, але дзякуючы спецыфічнаму фармату пераход на новы, дарослы ўзровень успрыняцця не адштурхоўвае юных чытачоў ад кніг, бо абмеркаванне ідзе ў роўным па ўзросце і інтарэсах асяроддзі.

Дапрафесійная медыяадукацыя будучых спецыялістаў з’яўляецца важным напрамкам, паколькі асновы неабходна закладваць яшчэ да паступлення [1, с. 7]. Гэтаму садзейнічае развіццё і стварэнне нацыянальных медыяпраектаў для дзіцячай аўдыторыі, скіраваных на сістэмнае фарміраванне ў падрастаючага пакалення беларусаў традыцыйных каштоўнасцей, яго далучэнне да культурнай спадчыны Беларусі. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць павышэння нацыянальнага статусу сацыяльна значымага медыякантэнту для дзяцей, які задавальняе іх інфармацыйныя запыты, з аднаго боку, і які адказвае запатрабаванням беларускага грамадства і дзяржавы ў захаванні айчыннай сістэмы выхавання і асветы, пераемнасці ў духоўным развіцці асобы, культурнай цэласнасці нацыі – з другога.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Бесова, Е. С., Минбалеев, А. В. Допрофессиональное медиаобразование и жуналистика / Е. С. Бесова, А. В. Минбалеев // Медиаобразование. – 2008. – № 4. – С. 4–13.

2. Мид, Маргарет. Культура и мир детства: избранные произведения / М. Мид. – Москва: Наука, 1988. – 429 с.

3. Косолапова, Д. И. Ювенильная журналистика в России: исторические и функциональные особенности: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.01.10 / Д. И. Косолапова. – Екатеринбург, 2015. – 23 с.

## РАДИОКАНАЛ «КУЛЬТУРА» В КОНТЕКСТЕ СОВРЕМЕННОГО АУДИОВИЗУАЛЬНОГО ПРОСТРАНСТВА БЕЛАРУСИ

**В. Г. Булацкий**
*Белорусский государственный университет*

Техника и рынок предопределили особенности функционирования культуры в современном обществе. Благодаря технике высокие ценности стали доступны для современного человека. Однако включение культуры в современные рыночные отношения, ориентация исключительно на коммерческий успех приводит к обесцениванию традиционных ценностей, накопленных человечеством.

В конце прошлого века децентрализация телерадиовещания в Беларуси привела к появлению в стране коммерческих телекомпаний и радиостанций. Оставаясь институтом формирования мировоззренческих взглядов, коммерческие аудиовизуальные СМИ отказались от своих просветительских функций в ущерб высшим интересам общества. И их дальнейшее развитие уже проходит без учета ценностных ориентиров, моральных и этических кодексов отечественной культуры.

Ориентация коммерческих СМИ исключительно на рейтинг и финансовый успех изменила цели и задачи этой модели радиовещания, сместив акценты в сторону развлекательности. Новые вещательные стратегии разрабатывались без учета такого важного фактора, как содержание передач. Упрощение стало общепринятым явлением. В эфире стали преобладать легкие для восприятия формы и жанры, которые не требуют ни интеллектуальных усилий, ни душевных затрат. Поэтому растет число радиослушателей жаждущих развлекательности. Молодежь, да и во многом люди среднего поколения попали в ситуацию разрыва с ценностями предшествующих